УДК 378.4

# АРГАНІЗАЦЫЯ ПАЗААЎДЫТОРНАЙ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ І РАСКРЫЦЦЁ ТВОРЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ СТУДЭНТАЎ У МЕЖАХ ВЫШЭЙШАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ УСТАНОВЫ

В. В. ПАНЕЖА
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт
Магілёў, Беларусь

У сучасным грамадстве адукацыя становіцца галоўным рэсурсам. Новыя эканамічныя рэаліі патрабуюць радзікальных змен у сферы адукацыі. Таму зразумелай становіцца павышаная ўвага і патрабавальнасць не толькі да адукацыйнай, але і да выхаваўчай (як неад’емнай часткі адукацыйнай) дзейнасці. Зразумела, што прыярытэтным і вядучым элементам адукацыйнага працэсу з'яўляецца тэхналогія дасягнення жаданых вынікаў працэсу выхавання і навучання як адзінага цэлага.

Адной з форм эфектыўнай арганізацыі пазааўдыторнай выхаваўчай работы і раскрыцця творчага патэнцыялу студэнтаў стала стварэнне на базе Беларуска-Расійскага ўніверсітэта інтэрактыўнага кабінета-музея прадметаў быту і культуры беларускага народа і народаў свету і выкарыстанне яго як у вучэбным, так і ў выхаваўчым працэсе (мал. 1). Экспазіцыя музея садзейнічае развіццю камунікатыўных кампетэнцый, падтрымцы творчых здольнасцяў студэнтаў, фарміраванню цікавасці да ўласнай культуры і культуры іншых народаў, паважлівым адносінам да маральных і духоўных каштоўнасцяў мінулых пакаленняў. На базе інтэрактыўнага кабінета-музея рэалізавана некалькі праектаў, у тым ліку праект «Захапляльныя прыгоды з Пані Мурай», які прадстаўляе сабой метадычную распрацоўку па арганізацыі пазааўдыторнай выхаваўчай работы і раскрыцці творчага патэнцыялу студэнтаў.




Мал. 1. Фрагменты экспазіцыі інтэрактыўнага кабінета-музея (фатаздымак)

Аўтары праекта (В. В. Панежа і Н. У. Мурадзян ) пры распрацоўцы праекта ставілі наступныя мэты:

1. Паглыбленне і стымуляванне цікавасці студэнтаў да культуры і гісторыі беларускага народа, яго духоўнай спадчыны.

2. Знаёмства студэнтаў з узорамі народнага мастацтва праз рэканструкцыю беларускіх народных свят дахрысціянскага паходжання.

3. Абуджэнне цікавасці ў студэнтаў (у тым ліку замежных) да беларускай мовы і культуры, беларускіх абрадаў і традыцый.

4. Раскрыццё дадатковых магчымасцяў для міжпрадметных сувязяў паміж дысцыплінамі гуманітарнага профілю падчас правядзення экскурсій па Беларусі.

5. Павышэнне ўзроўню самаадукацыі студэнтаў праз іх удзел у віктарынах, квэстах, інтэрактыўных гульнях-тэстах.

На базе інтэрактыўнага кабінета-музея арганізатары праекта распрацавалі і правялі тэатральна-конкурснае прадстаўленне «Дванаццаць месяцаў» па матывах п’есы-казкі С. Маршака «Дванаццаць месяцаў»; квэст у Лошыцкім сядзібна-паркавым комплексе (г. Мінск) з наведваннем музея «Лошыцкая сядзіба»; рэканструявалі славянскае народнае свята дахрысціянскага паходжання «Каляды», беларускі народны тэатр лялек «Батлейка» на рэлігійную і бытавую тэматыку (прадстаўленне «Бацькава навука»); арганізавалі, распрацавалі і правялі інтэрактыўную віктарыну-тэст «Загадкавы Ракаў» па выніках экскурсіі ў арт-галерэю «Янушкевічы» (г. Ракаў, Мінская вобласць), віктарыну «З гісторыі Полацка» па выніках экскурсіі ў Полацк; стварылі відэаролікі на аснове матэрыялу праведзеных мерапрыемстваў.

Пры рэалізацыі праекта актыўна выкарыстоўваліся экспанаты інтэрактыўнага кабінета-музея, многія прадметы для афармлення залы, дзе праводзілася прадстаўленне, студэнты зрабілі самі (лялькі для батлейкі «Бацькава навука», скрыня ў выглядзе хаткі для паказу прадстаўлення і інш.). Такая форма працы садзейнічае матывацыі студэнтаў, прыцягненню іх да актыўнага ўдзелу ў мерапрыемствах.

Сабраны і метадычна аформлены матэрыл актыўна выкарыстоўваецца ў вучэбным працэсе ў межах дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» пры вывучэнні такіх тэм, як «Мова і соцыум», «Лексічны склад беларускай мовы», «Гістарычныя этапы паходжання і развіцця беларускай мовы», «Беларуская мова сярод іншых славянскіх моў», і дысцыпліны «Русский язык как иностранный».

Такім чынам, матывацыйны прынцып павінен стаць адным з асноўных накірункаў у арганізацыі пазааўдыторнай выхаваўчай работы. Для рэалізацыі пастаўленых мэт вельмі важна сфарміраваць у студэнтаў выразна акрэсленыя матывы, разуменне неабходнасці іх дзейнасці, што, у сваю чаргу, стымулюе цікавасць да вывучаемага прадмета.